УДК 81'272

# ІНТЭРНЭТ-ЗНОСІНЫ ЯК СПЕЦЫФІЧНЫ ВІД КАМУНІКАЦЫІ

**Шаршнёва Вольга Мікалаеўна**
загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства
ўстановы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова"; кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

У сучасным грамадстве, яго жыцці і жыцці чалавека як грамадскай асобы Інтэрнэт з'яўляецца неад'емнай, надзвычай неабходнай часткай, аператыўнай крыніцай інфармацыі аб навакольным свеце, важным сродкам камунікацыі. Варта, аднак, заўважыць, што Інтэрнэт-зносіны маюць свае спецыфічныя ўласцівасці, якія адрозніваюць іх ад традыцыйных, непасрэдных, кантактных зносін. Асаблівасці электронных камунікацый абумоўліваюцца формай зносін, масавасцю і не ў апошнюю чаргу тым, што менавіта моладзь (па прычыне яе ўзроставай прагрэсіўнасці і таму цікаўнасці да электронных дывайсаў) з'яўляецца асноўнай актыўнай часткай Інтэрнэт-супольнасці, якая фарміруе, развівае і ўдасканальвае фомы Інтэрнэт-зносін. У апошні час віртуальная камунікацыя ўсё часцей і часцей замяняе рэальную нават паміж людзьмі, якія знаходзяцца побач: людзі збіраюцца, каб разам пацікавіцца навінамі Інтэрнэту.

Т. Ю. Вінаградава ў шэрагу асноўных прычын, якія ўплываюць на актыўны ўдзел у Інтэрнэт-зносінах, называе наступныя: ананімнасць, своеасаблівасць працякання працэсаў міжасабовага ўспрыняцця ва ўмовах адсутнасці невербальнай інфармацыі, добраахвотнасць і пажаданасць кантактаў, ускладненасць эмацыйнага кампаненту зносін у сувязі з настойлівым імкненнем да эмацыйнага напаўнення тэксту, імкненне да нетыповых, ненарматыўных паводзін [1, с. 63]. Даследчыкі электроннага дыялога адзначаюць дынаміку маўленчага ўзаемадзеяння, сістэмнасць абавязкаў яго ўдзельнікаў па задавальненні камунікацыйных патрэб субяседніка [2], інтэрактыўны характар, поліфанічнасць і дыстантнасць [3], крэалізаванасць і гіпертэкставасць з уласцівымі ёй фрагментарнасцю, нелінейнасцю, бясконцасцю, разнароднасцю [4] і інш.

Л. Ю. Іваноў настойвае на ўспрыняцці электроннай камунікацыі як асобай функцыянальнай разнавіднасці мовы, або падмовы, і ўказвае шэраг прычын слушнасці такога меркавання: "Па-першае, сфера функцыявання гэтай падмовы выразна адмежавана ад іншых сфер камунікацыі, паколькі яна ажыццяўляецца пры дапамозе тэхнічных электронных сродкаў і з'яўляецца апасродкаванай ім. Па-другое, гэта падмова служыць задавальненню спецы-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

фічных камунікацыйных мэтаў (фатычнай мэты – зносіны дзеля зносін і г.д.). Па-трэцяе, гэта падмова "ініцыявала" ўзнікненне новай сістэмы мультымедыйных жанраў і жанравых фарматаў і ў выніку спрыяла развіццю новага напрамку ў тэорыі канвенцыйных жанраў – віртуальнага жанразнаўства. Пачацвёртае, моўныя сродкі гэтай разнавіднасці мовы характарызуюцца пэўным наборам унікальных (ці практычна ўнікальных лексічных і граматычных) характарыстык, якія могуць лёгка вылучацца, фармалізавацца і ўтвараць адзіны прагматычны комплекс" [5].

Сапраўды, віртуальны дыялог успрымаецца як надзвычай спецыфічная функцыянальная разнавіднасць мовы, якая ўплывае на папаўненне лексічнага і фразеалагічнага запасу літаратурнай мовы, на ўзбагачэнне яе арыгінальнымі граматычнымі канструкцыямі, на пашырэнне магчымасцей экспрэсіўнага і непасрэдна звязанага з ім імпліцытнага выражэння выказвання, урэшце, на фарміраванне новых жанраў. Аднак наўрад ці можна пагадзіцца з усімі пазіцыямі даследчыка, асабліва з тым, што электронная мова адмежавана ад іншых сфер камунікацыі і служыць задавальненню пераважна фатычнай мэты толькі таму, што ажыццяўляецца пры дапамозе тэхнічных электронных сродкаў. Тэхнічная рэалізацыя Інтэрнэт-дыялога зусім не пазбаўляе яго сувязі з ужо вядомымі формамі рэалізацыі як вуснага, так і пісьмовага маўлення (у прыватнасці, такімі, як вусны дыялог, маналог, пісьмо, запіска). Наадварот, магчымасць уплываць на ўзнікненне і развіццё новай сістэмы мультымедыйных жанраў і віртуальнага жанразнаўства накіроўвае на перавагу не толькі і не столькі асобаснай фатычнай мэты, колькі на дасягненне групавых, сацыяльных, эстэтычных, пазнавальных і іншых мэтаў, здольных уплываць на фарміраванне стыляў мовы і маўлення.

Несумненна важнай, неад'емнай, абавязковай уласцівасцю электроннага дыялога неабходна назваць інтэртэкстуальнасць. Віртуальны дыялог у значна большай ступені, чым вусны або стылізаваны мастацкі дыялог спалучае ў сабе розныя формы інтэртэкстаў: цытацыю з усімі яе разнавіднасцямі (цытата-аргумент, цытата-прыклад, цытата-замяшчальнік), пераказ у форме ўскоснай мовы тэкстаў іншых аўтараў, фонавыя спасылкі на тэорыю ці ідэі, выказаныя раней. Па сутнасці, віртуальны дыялог з'яўляецца інтэртэкстам: усе яго структурныя часткі, макра- і мікрадыялогі (адпаведна, макра- і мікратэксты) аб'яднаны адной тэмай (або з'яўляюцца рознымі рэакцыямі на адно паведамленне ці падзею); адлюстроўваюць вопыт папярэдніх і сучасных культур, маўленчых структур, суіснуюць у арыгінальным спалучэнні ўласных выказванняў і свядома або несвядома выкарыстаных цытат.

Усё адзначанае дае права ўспрымаць Інтэрнэт-камунікацыю як унікальны, спецыфічна арганізаваны інтэртэкст (гіпертэкст) з усімі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

уласцівымі для яго унутрытэкставымі і падтэкставымі катэгорыямі, а сукупнасць тэматычна аб'яднаных рэплік характарызаваць як дыялагічнае адзінства, арганізаванае на адметных прынцыпах, блізкіх да спалучэння рэплік у вусным маўленні і адначасова рэзка, нават катэгарычна, супрацьпастаўленых ім.

Даследванне віртуальнага маўлення павінна, па-першае, прадугледжваць зварот да цэлага шэрагу праблем, актуальных пры характарыстыцы любых рэалізацый мовы (маецца на ўвазе захаванне ўсіх тыпаў нормаў – моўных, камунікацыйных, этычных; выяўленне спецыфікі выкарыстання вербальных і невербальных сродкаў); па другое, абапірацца на выніку навуковага аналізу пытанняў, непасрэдна звязаных са спецыфікай пэўнага віду маўленчага ўзаемадзеяння, у ліку якіх варта назваць супастаўленне дыялагічных адзінстваў розных тыпаў з мэтай выяўлення ўласцівых ім камунікацыйных нормаў, ацэнку прагматычнай эфектыўнасці канктрэтных дыялогаў, вывучэнне ўмоў неабходнага камунікацыйнага выніку і інш.; па-трэцяе, улічваць магчымасці імпліцыйнага насычэння адзінстваў, больш шырокія ў параўнанні з вуснымі і стылізаванымі мастацкімі дыялагічнымі адзінствамі (так, напрыклад, зусім нячастая ў вусных і стылізаваных мастацкіх дыялогах алюзія становіцца ледзь не самым важным сродкам выражэння падтэкставай інфармацыі ў электронных дыялогах); па-чацвёртае, арыентавацца на лінгвакультуралагічныя асаблівасці функцыянавання беларускай віртуальнай прасторы, спалучэнне індывідуальнага і агульнага, спецыфічнага і тыповага, аднамоўнага (беларускага) і двухмоўнага (руска-беларускага) у сістэме Інтэрнэт – Рунэт – Белнэт.

**Літаратура**


1. *Виноградова, Т. Ю.* Специфика общения в интернете / Т. Ю. Виноградова // Русская и сопоставительная филология : лингвокультурологический аспект. – Казань, 2004. – С. 63–67.
2. *Самойленко, Л. В.* Электронный диалог как особый тип прагматических связей чат – коммуникантов / Л. В. Самойленко // Вестник Астраханского государственного технического университета. – 2015. – № 2 (60). – С. 94–101.
3. Белинская, Е. П. Личность и новая информационная среда / Е. П. Белинская, О. А. Тихомандрицкая // Социальная психология личности : учебное пособие для вузов. – М. : Аспект-Пресс, 2001. – 301 с.
4. Лутовинова, О. В. Линвокультурологические характеристики виртуального дискурса : диссертация … доктора филологических наук : 10.02.19 / О. В. Лутовинова. – Волгоград, 2009. – 519 с.
5. Иванов, Л. Ю. Язык в электронных средствах коммуникации / Л. Ю. Иванов // Культура русской речи : энциклопедический словарь-справочник / под общ. рук. Л. Ю. Иванова, А. П. Сковородникова, Е. Н. Ширяева; РАН, Ин-т русского языка им. В. В. Виноградова. – М. : Флинта : Наука, 2003. – 840 с. – С. 791–793.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова